КАЗАЧНАЯ СКАРБНІЦА

УДК821.131.1-93-343.4 + 821.113.4-93-343.4
ББК83.84(4Ита)-445 + 83.84(4Дан)-445
К14

Серыя «Любімыя казкі» заснавана ў 2019 годзе

У перакладзе К. П. Масэ

Пераклад ажыццёўлены па выданні:
«Сказочная сокровищница», Минск, Харвест, 2019 г.

К14 **Казачная скарбніца** / перакл. з руск. мовы К. П. Масэ. — Мінск : Харвест, 2019. — 32 с. : іл. — (Любімыя казкі).

ISBN 978-985-18-4721-7.

Чароўныя і мудрыя казкі, якія захаваліся ў памяці розных народаў свету, а таксама казкі вялікіх казачнікаў, раскажуць вашаму дзіцяці аб незвычайных прыгодах казачных герояў – нечаканых, дзіўных, смешных, добрых і павучальных!

У кнігу ўвайшлі казкі ў перакладзе К. П. Масэ: «Нядбайла» (італьянская народная казка), «Дзіцячая балбатня» (па матывах казкі Ганса Хрысціяна Андэрсэна), «Снегавік» (па матывах казкі Ганса Хрысціяна Андэрсэна).

УДК821.131.1-93-343.4 + 821.113.4-93-343.4
ББК83.84(4Ита)-445 + 83.84(4Дан)-445

ISBN 978-985-18-4721-7

© Укладанне. Афармленне. Пераклад.
ТАА «Харвест», 2019.

(Па матывах казкі
Ганса Хрысціяна Андэрсэна)

СНЕГАВІК

– Слаўны марозік – так і храбусціць ува мне! – сказаў Снегавік. – А вецер – так і кусае! Любата! А ты чаго ўтаропілася, лупатае? – гэта ён да сонца звяртаўся, якое акурат заходзіла. – Зрэшты, валяй, валяй! Я і не міргну! Вытрымаем!

Замест вачэй у яго тырчэлі два аскепкі дахоўкі, замест рота красаваўся адломак старых грабляў – значыць, ён быў і з зубамі.

На свет Снегавік з'явіўся пад радасныя «ўра» хлапчукоў, пад звон бомак, рыпенне палазоў і лускат рамізніцкіх бізуноў.

Сонца зайшло, і на блакітнае неба выплыў месяц, поўны, ясны!

– Бач, з другога боку паўзе! – сказаў Снегавік, падумаўшы, што гэта зноў сонца паказалася. – І ўсё ж такі вочы на мяне лупіць я яго адвучыў. Няхай сабе вісіць і свеціць паціху, каб мне было відаць сябе. Ах, як бы мне зрушыцца з месца? Так бы і пабег на лёд пакатацца, як нядаўна хлапчукі! Але бяда – не магу варухнуцца.

– Вунь! Вунь! – хрыпата забрахаў стары Сабака на ланцугу. Калісьці ён жыў у хаце і ляжаў каля печкі. – Сонца навучыць цябе рухацца. Я бачыў, што было летась з такім, як ты, і ў пазамінулым годзе – таксама. Вунь! Вунь! Няма вунь больш нікога!

– Аб чым ты гамоніш, дружа? – спытаў Снегавік. – Вунь тое лупатае навучыць мяне рухацца? – і ён па-

казаў на месяц. – Яно ж само ўцякло ад мяне толькі што – так пільна я паглядзеў на яго. А цяпер вунь зноў выпаўзла з другога боку.

– Шмат ты разумееш! – сказаў Сабака. – Ну так, цябе ж толькі што вылепілі! Той, што глядзіць цяпер, – месяц, а тое, што зайшло, – сонца. Яно зноў вернецца заўтра і ўжо дакладна пасуне цябе – наўпрост у канаву. Чую я, надвор'е пераменіцца: левая нага заныла. Пераменіцца, пераменіцца!

– Не разумею я цябе нешта, – сказаў Снегавік. – Прарочыш мне нядобрае. Тое чырвонавокае, што завуць сонцам, мне не сябар – нутром чую.

– Вунь! Вунь! – прагаўкаў Сабака, тры разы павярнуўшыся вакол сябе, і ўлёгся ў будцы спаць.

Надвор'е насамрэч перамянілася. Раніцай усё наваколле было ахінута густым, цягучым туманам. Неўзабаве падзьмуў рэзкі, ледзяны вецер і затрашчаў мароз. А што была за прыгажосць, калі ўзышло сонейка!

Дрэвы і хмызы ў садзе стаялі пакрытыя шэранню – нібыта лес з белых каралаў. Усё галінне быццам бы ўбралася ў бліскучыя белыя кветачкі. Найдробныя разгалінаванні, якіх улетку нават і не бачна з-за густой лістоты, цяпер выразна вымалёўваліся найтанчэйшым карункавым узорам асляпляльнай белізны. Ад кожнай галінкі нібыта лілося ззянне.